На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

www.nv-online.info

Народная Воля

№85 (3928)

31 кастрычніка 2014 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

АФІЦЫЙНА

Крэдытныя стаўкі на жыллё не зменшацца

Такую заяву зрабіла старшыня праўлення Нацыянальнага банка ***Надзея Ермакова*** *падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.*

Паводле яе слоў, крэдытаванне на будаўніцтва жылля для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, па стаўцы ў памеры 16 працэнтаў гадавых могуць аднавіць у Беларусі ў 2015 годзе. *"У бягучым годзе не вернуць, але, магчыма, у наступным"*, — сказала кіраўнік Нацбанка. Пакуль жа Ермакова параіла грамадзянам *"разлічваць на свае магчымасці"*.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

Ці сыдзе Мясніковіч у адстаўку?

Белстат апублікаваў чарговыя дадзеныя: за 9 месяцаў бягучага года складскія запасы ў прамысловасці выраслі на 18,7%, на складах беларускіх прадпрыемстваў назапасілася прадукцыі на 33 трлн 176,3 млрд рублёў.

Ці стане гэта падставай адправіць у адстаўку прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, што Аляксандр Лукашэнка пагражаў зрабіць не раз?

Забітыя пад столь нерэалізаванай прадукцыяй склады дзяржпрадпрыемстваў — гэта, на жаль, рэаліі не цяперашняга дня, а праблема апошніх гадоў, аб якой перманентна ўспамінае Аляксандр Лукашэнка. Так на пачатку гэтага года, прымаючы з дакладам Міхаіла Мясніковіча, кіраўнік дзяржавы заявіў: "Як было, так і застаецца пытанне рэалізацыі нашай прадукцыі. Натуральна, што гэта валюта, натуральна, не дай Бог нам паўтарыць нават леташнюю сітуацыю, што адбіваецца і на грашова-крэдытнай палітыцы, і на валютным рынку". Лукашэнка заўважыў, што калі Мясніковіч хоча "ўседзець у крэсле", то не павінна быць "гэтай манілаўшчыны", чыноўнікі мусяць працаваць над тым, каб беларускія тавары не пыліліся на складах, а актыўна прадаваліся за межамі краіны.

Аднак ужо ў чэрвені Белстат ашаламіў новымі дадзенымі: складскія запасы ў прамысловасці на 1 мая дасягнулі 82,4% сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці, г.зн. лічбы былі яшчэ больш сумныя, чым 30 студзеня, калі Мясніковіч атрымаў заданне па разгрузцы складоў.

Але ў крэсле Мясніковіч уседзеў. Праўда, 11 чэрвеня Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях развіцця прамысловага комплексу і рэалізацыі беларускай прадукцыі і ўвёў персаніфікаваную адказнасць членаў урада за разгрузку складоў. "Усе даручэнні павінны быць персаніфікаваны. Напрыклад, Мясніковіч адказвае за разгрузку складоў МАЗа, Якабсон — за тое, Сямашка — за гэта, і гэтак далей. Не забудзьцеся пры гэтым МЗС", — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Тады ж Міхаіл Мясніковіч, адказваючы Аляксандру Лукашэнку, запэўніў, што "ў чэрвені—верасні сітуацыя з затаваранасцю складоў павінна значна палепшыцца, плануецца павялічыць аб'ёмы закупкі прадукцыі на ўнутраным рынку".

І што мы маем сёння?

Больш за ўсё нерэалізаванай прадукцыі сабралася якраз-такі на складах прадпрыемстваў, якія выпускаюць машыны і абсталяванне. Белстат рапартуе: за дзевяць месяцаў 2014 года складскія запасы грузавых аўтамабіляў (без кар'ерных самазвалаў) выраслі амаль на 1,8 тыс. штук, самазвалаў — на 349, прычэпаў і паўпрычэпаў аўтамабільных — на 388, аўтобусаў — на 222, трактароў — на 5,4 тыс. штук. Гэта амаль у 2,5 раза вышэй сярэднямесячнага аб'ёму. Атрымліваецца, што праца па разгрузцы складоў правалена менавіта ў той сферы, за якую адказваў прэм'ер-міністр персанальна. Што да агульнай лічбы, то па стане на 1 кастрычніка 2014 года складскія запасы склалі 76,7% сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці супраць 70,2% на пачатак года.

Ці значыць гэта, што ўрэшце Аляксандр Лукашэнка пяройдзе ад слоў да дзеянняў і адправіць Міхаіла Мясніковіча ў адстаўку? Праўда, калі такая кадравая перастаноўка і здарыцца, ці вырашыць яна праблему загружанасці складоў, ці стануць нашы тавары канкурэнтаздольнымі і "купляць беларускае" пачнуць за межамі Беларусі? Пытанне, як кажуць, рытарычнае...

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

БЛІЦ

29 кастрычніка адзначаўся Дзень памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій — у гэты дзень у 1937-м за адну ноч было расстраляна больш за сотню беларускіх літаратараў, навукоўцаў, грамадскіх дзеячаў. 2 лістапада — "Дзяды", і калона актывістаў зноў пойдзе шляхам на Курапаты.

Дэмакратычная супольнасць Беларусі, сваякі і нашчадкі загінуўшых амаль 20 гадоў намагаюцца дабіцца ўсталявання паўнавартаснага мемарыяла, помніка ахвярам рэпрэсій камуністычнага рэжыму. Але дзяржава нібы не чуе гэтых прапаноў. У гэтыя сумныя дні "Народная Воля" вырашыла пацікавіцца ў самых розных людзей:

Ці патрэбны Беларусі мемарыял ахвярам сталінскага і камуністычнага рэжыму?



Зміцер ДАШКЕВІЧ, сустаршыня "Маладога фронту" (зарэгістраваны ў Чэхіі):

— Для людзей, якія прагнуць перамен у Беларусі, гэтага пытання ўвогуле не існуе, яно бясспрэчнае. Таму што, калі не будзе помніка тым людзям, якія пацярпелі ад камуністычных улад, не будзе нічога. Без такіх помнікаў нічога не пабудуеш. Такія помнікі павінны быць на месцах масавых расстрэлаў людзей, і кожны павінен бачыць гэтыя напаміны пра плады камуністычнай дзейнасці. А то сёння ўсе бачаць толькі дзядулю Леніна і кветкі каля ягонага помніка, а вось помніка сотням тысяч забітых тымі "добрымі дзядулькамі" ніхто не можа пабачыць.

Аляксандр ДАБРАВОЛЬСКІ, сябра палітрады Аб'яднанай грамадзянскай партыі:

— Помнік неабходны, таму што амаль у кожнай сям'і ёсць пацярпелыя ад рэпрэсій камуністычнага рэжыму. Мой дзед быў забіты. Толькі праз шмат гадоў яго рэабілітавалі. Помнікі патрэбны нават дзеля таго, каб былі пазначаны маральныя межы для новых урадаў. Помнік перш за ўсё трэба ўсталяваць у Курапатах у мемарыяльным комплексе. Што да самой сталіцы, то трэба ўпарадкаваць назвы вуліц, а то яны ўсе ці то Савецкая, ці то Леніна, ці Камуністычная, да таго ж і помнікі стаяць партыйным функцыянерам, на сумленні якіх бязвінна забітыя тысячы і тысячы людзей. Ёсць прыклад той жа Літвы — усе камуністычныя помнікі перанеслі ў парк, зрабілі там а-ля савецкі рэстаран. Кожны жадаючы можа наведаць той запаведнік.

Сяргей КАЛЯКІН, старшыня партыі левых "Справядлівы свет":

— Не ведаю. Калі хто хоча ўсталяваць такі помнік, то няхай усталёўвае за кошт ахвяраванняў. Але не за кошт дзяржавы. Увогуле, спачатку трэба правесці шырокую дыскусію на гэты конт. Калі будзе прынята агульнае рашэнне, што такі помнік патрэбны, то толькі тады яго і ўсталёўваць. Але я лічу, што сёння ў нашай краіне гэта не самае галоўнае пытанне.

Аляксей ШЭІН, каардынатар ініцыятывы "Хрысціянскі рух":

— Адназначна помнік патрэбны. Адзін — абавязкова ў Курапатах, другі — у цэнтры горада. Лепшае месца — гэта тое, дзе стаяў помнік Сталіну, — на Кастрычніцкай плошчы. Што да помнікаў Леніну, Калініну ды іншым партыйным "таварышам", то ўзгадваецца адно выказванне: лепшы помнік ахвярам — гэта адсутнасць помнікаў іх катам.

Міхаіл БУДАЙ, член прафкама Мінскага аўтамабільнага завода:

— Ну, у нас жа стаяць крыжы ўздоўж дарогі ў Зялёным Лузе... А каб сапраўдны помнік паставіць, дык нават не ведаю... У цэнтры Мінска, напэўна, не паставяць. На Кастрычніцкай плошчы нешта пабудуюць і там жа зімой каток заліваюць. Замест Леніна?.. А што Ленін каму кепскае зрабіў?..

Андрэй БЕЛЯКОЎ, сакратар БРСМ Цэнтральнага раёна Мінска:

— На такое пытанне я адказаць не гатовы... На жаль, мне няма чаго дадаць да гэтага.

Уладзімір ІВАНКОЎ, фермер з Лынтупаў:

— Для мяне гэта нават не пытанне. У мяне цэлая сям'я знішчана. Два браты майго дзеда забіты. У лагерах на тэрыторыі сучаснай Літвы былі яго сёстры. Потым, пасля вайны, у 1947 годзе, — таксама рэпрэсіі. Мае сваякі ратаваліся ад камуністаў, дык цяпер па ўсім свеце раскіданы: хто ў Канадзе, хто ў Аўстраліі, хто ў Новай Зеландыі... Помнік патрэбны, і стаяць ён павінен насупраць КДБ. На тым месцы, дзе цяпер Дзяржынскі.

Марыя ПАРХОМЧЫК, пенсіянерка:

— Людзей шмат забілі. Раней маё пакаленне толькі ціха на кухні пра гэта гаварыла. Ніхто ж нічога дакладна не ведаў. Мой дзед у лагерах здароўе згубіў. Бабуля адна дзяцей гадавала, дык гэтыя дзеці яшчэ ж і былі "дзецьмі ворага народа". Не атрымалі мы, малыя, бацькавай ласкі, толькі думалі, як выжыць. І за што гэта нам усё было? Будавалі светлую будучыню. І вось яна настала — на пенсію не пражыць, лекі не купіць, не тое што на курорт — у вёску каб з'ездзіць, трэба перш грошы назапасіць. Помнік трэба паставіць. Вялікі-вялікі! Каб ніколі такога не паўтарылася.

Любоў ЛУНЁВА.

АКТУАЛИИ



Светлана КАЛИНКИНА

Закупайтесь валидолом

Сегодня я видела, как в аптеке плакала женщина. Сначала она пыталась что-то объяснить про маму, которая живет в деревне; про пять стариков, живущих по соседству; про автобус до райцентра, где больница, который ходит только три дня в неделю, два из которых — суббота и воскресенье...

Потом она пыталась убедить провизора, что не преступница, что ей не нужны ни наркотики, ни яды. Наоборот, нужно что-то сердечное, какие-то антибиотики, ибуклин, так как грядет простудный период. Одним словом, джентльменский набор лекарств для старых людей.

— Да не могу я вам продать, — твердила в ответ провизор по ту сторону прилавка. — Это все по рецептам, и за каждое проданное лекарство я теперь рецептом врача должна отчитаться.

— Но я же не Бог весть что прошу!.. Ну нет у нас в деревне врача! Ну не могут старики до райцентра доехать!

— Женщина, милая, я все понимаю, я очень сочувствую. Но ничем не могу помочь. Не могу!

— И что теперь? Пусть люди лечатся травками и примочками? Пусть умирают, потому что у них нет бумажки?

Женщина-провизор только смотрела на покупательницу сочувствующими и какими-то больными глазами.

А та уже не могла продолжать монолог, потому что... расплакалась. Бросила только:

— НЕ-НА-ВИ-ЖУ! Как же я ненавижу это государство! Что ни сделают — все против людей.

Впрочем, расплакаться была готова и сотрудница аптеки.

Оказывается, у нас, как всегда, "позаботились" о людях.

Раньше приходил человек в аптеку и мог купить одну пластинку таблеток, так как сразу на полный курс денег хватает не всегда и не у всех. Через какое-то время, с новой пенсии, человек шел и покупал вторую, третью и так далее "порции". Теперь исхитриться не получится. Просто потому, что рецепт на лекарство придется оставить в аптеке. И без него "докупить" выписанное лекарство вы уже не сможете.

Раньше, если в аптеке не было выписанного врачом препарата, вам могли продать аналог. Фармацевты ориентировались на основное действующее вещество. Теперь вам могут продать только то лекарственное средство, которое указано в рецепте. И никаких замен.

Раньше врач мог выписать больному импортный, более эффективный, препарат. Теперь в случаях, если имеется белорусский аналог, — только лекарства белорусского производства.

Все рецепты, выписанные до 19 октября, которые имеются у вас на руках, — выбросьте. Сейчас на каждое лекарство должен быть отдельный рецепт, срок его действия — один месяц. Причем для разных категорий лекарств — разные цвета бланков. В общем, спешите в поликлинику и штурмуйте врачей по новой.

Вот, если коротко, то, что успела рассказать мне женщина-провизор. И я, честно признаюсь, слушала ее с открытым от удивления ртом.

Такие меры можно было бы понять, если бы мы, как граждане многих стран мира, сами за лекарства не платили, если бы их стоимость оплачивали страховые компании.

Такие меры можно было бы понять, если бы у нас не было дефицита врачей, если бы не закрывались массово больницы в сельской местности, если бы пустовали поликлиники, если бы к узким специалистам не надо было записываться за недели и месяцы...

Такие меры можно было бы понять, если бы белорусская фармацевтическая промышленность являлась самой передовой в мире, если бы именно за нашими лекарствами гонялись и на Западе, и на Востоке, а мы твердой рукой государства заботились, чтобы их хватало своим, белорусам.

Но ведь на каждое это "если бы" правильный ответ — "Нет!".

За лекарства мы платим сами и дорого. К врачам не пробиться. Во многих регионах узкие специалисты — один на несколько районов. В сельской местности закрыли даже маленькие ФАПы — не то что сельские больницы. А белорусские лекарства... Ну, наверное, не такие они хорошие, если предприятиям некуда их девать, и Минздрав идет на поистине драконовские меры, чтобы продать их "пад прымусам" хотя бы нам, белорусам.

И все-таки Министерство здравоохранения должно в первую очередь думать не о выручке отечественных фармацевтических компаний, не об экономии для государства валютных средств, а о здоровье людей. Сейчас они говорят, что именно о здоровье и заботятся, борются с самолечением. Но это отговорка в чистом виде. Представляете, какие масштабы приобретет это самое самолечение и какие будет иметь последствия, если народ перейдет на травки и примочки, не имея доступа ни к врачам, ни к привычным лекарствам? Представляете, до каких запущенных случаев доведет?

Впрочем, у Минздрава есть план следующих шагов, и забота о подобных нюансах в его стратегию не вписывается. Как известно, уже давно озвучена идея — брать плату за посещение поликлиник. Вот теперь ее смело можно вводить. Представляете, насколько чаще нам сейчас нужно будет бегать к врачам за рецептами?.. Представляете, сколько дополнительных денег мы выложим?..

Это ж какой доход государству будет! И все под маркой заботы о людях.

Разве у молодежи хватит терпения и мудрости высиживать бумажку-рецепт под кабинетом в поликлинике? Да водкой они будут боль глушить! И советами из интернета.

А старики в деревнях, которые до врача просто не могут доехать? А городские пенсионеры, у которых на такое медицинское обслуживание просто не хватит денег?

Всякого можно было ожидать от нашего, давно не социально ориентированного, государства. Но все-таки не такого откровенного цинизма.

УЧОРА

Савет ЕС прадоўжыў санкцыі ў дачыненні да Беларусі

Але са спісу выкраслены 24 чалавекі і сем прадпрыемстваў. Хто канкрэтна атрымаў магчымасць выязджаць у краіны Еўрапейскага Саюза, пакуль не паведамляецца. Але дакумент будзе апублікаваны ў Афіцыйным журнале ЕС ужо сёння, 31 кастрычніка.



Што да тэрміну дзеяння абмежавальных мер Еўрасаюза ў дачыненні да Беларусі, то ў чарговы раз ён прадоўжаны на год, да 31 кастрычніка 2015 года.

У паведамленні ўдакладняецца, што санкцыі ЕС складаюцца з эмбарга на пастаўкі ўзбраенняў і "абсталявання для ўнутраных рэпрэсій", а таксама замарожвання рахункаў і забароны на ўезд на тэрыторыю ЕС для фізічных асоб. Актывы ўнесеных у спіс прадпрыемстваў таксама падлягаюць замарожванню.

Санкцыі ЕС дзейнічаюць у дачыненні да больш як 200 асоб, у тым ліку кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі, ягоных сыноў — Віктара і Дзмітрыя, старшыні КДБ Валерыя Вакульчыка, кіраўніка Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзіі Ярмошынай, міністра юстыцыі Алега Сліжэўскага і іншых прадстаўнікоў беларускай улады.

"Чорны спіс" ЕС быў сфарміраваны пасля прэзідэнцкіх выбараў 2006 года ў сувязі са "шматлікімі парушэннямі правоў чалавека" і быў пашыраны пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі ў снежні 2010 года.

ДА ВЕДАМА

Павялічваюцца выплаты на дзяцей

З 1 лістапада ў Беларусі зацверджаны новы бюджэт пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (БПМ). Ён на 3,9% перавышае нарматыў, які дзейнічае з 1 жніўня па 31 кастрычніка і складае 1 мільён 396 тысяч рублёў. Адпаведна з павышэннем БПМ падвысяцца і памеры некаторых відаў дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

Дапамога	Было (з 1.08 па 31.10)	Будзе (з 1.11 па 31.01.2015)
Аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці	13.434.000	13.960.000
Аднаразовая дапамога пры нараджэнні другога і наступных дзяцей	18.807.900	19.544.000
Штомесячная дапамога на дзяцей старэйшых за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, якія вызначаюцца заканадаўствам, на дзіцяці-інваліда на іншых дзяцей у сям'і	940.400 руб. 671.700	977.000 698.000
Штомесячная дапамога па доглядзе за дзіцяці-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў	1.343.420	1.396.000
Штомесячная дапамога на дзіцяці ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае ВІЧ	940.400	977.000

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА



Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Потонем вместе?

На внешнеторговом фронте Беларуси дела идут с переменным успехом. Радость по поводу экспортных возможностей, открывшихся в связи с российским эмбарго на ввоз продовольствия из стран ЕС, сменилась разочарованием. Экспорт продовольствия в Россию Беларусь нарастила где в 1,3 раза, а по некоторым позициям и в 1,5 раза в натуральном выражении, но в стоимостном, в пересчете на доллары, экспортная выручка падает. А все из-за обвальной девальвации российского рубля. С начала года он обесценился к "зеленому" на 24%, в то время как белорусский рубль — на 12%. Его укрепление к российскому собрату сделало наш экспорт в Россию менее выгодным, зато, соответственно, более выгодным сделало экспорт россиян в нашу страну. Можно, конечно, поднять экспортные цены в российских рублях, но не факт, что это поможет. Ведь от ножниц в девальвации рублей союзников страдает и наш промышленный экспорт. Например, работники МАЗ, МТЗ и других заметных предприятий давно уже перешли на неполную рабочую неделю по причине затоваренности.

Председатель Нацбанка Надежда Ермакова и вовсе заявила, что мы за российским рублем не побежим, то бишь у нас свой график девальвации к доллару. И то правда. Если белорусский рубль пикирнет вслед за российским, наши вкладчики — не российские — сразу без сожаления начнут избавляться от все еще доходных депозитов в родных рублях и встанут в очереди в "обменники". Впрочем, россияне уже встали: во многих их обменниках объявления "Валюты нет" становятся привычными. Несмотря на слова госпожи Ермаковой, Нацбанк все же планирует ускорить девальвацию "зайчика" к корзине иностранных валют. До 1% в месяц. Потому что непонятно, насколько может еще упасть российский рубль под давлением западных санкций. В связи со снижением мировых цен на нефть до минимума с 2010 года (марки Brent до 85 долларов за баррель) — как считают, по сговору США и Саудовской Аравии — Россия потеряла кучу долларов валютной выручки. Свидетельство тому тот факт, что только в течение недели Центробанк России потратил на бирже 4 миллиарда долларов из валютных резервов на удержание своего рубля от еще более крутой девальвации. Но все-таки курс превысил по доллару отметку в 41 рубль, а по евро подбирается к 52 рублям.

У нас резервов, как и раньше, кот наплакал — всего 6 миллиардов долларов. Если отбросить монетарное золото (в слитках), чем по долгам срочно не рассчитаешься, а взять только валютную составляющую, то и вовсе останется 3,9 миллиарда в долларовом эквиваленте. Как с такими резервами, да при наших внешних долгах, можно чувствовать себя спокойными? Долги надо отдавать прежде всего за счет собственной валютной выручки, а не путем новых заимствований. Но здесь у нас дела совсем не ободряющие. За январь—август экспорт товаров составил 25,2 миллиарда долларов, что на 1,5% меньше, чем за аналогичный период прошлого года, а импорт — 26,7 миллиарда, меньше прошлогоднего на 6,3%. В итоге сальдо отрицательное.

Однако не все так плохо. Увеличил экспорт удобрений "Беларуськалий" (15,8%). "Изобретатели" концерна "Белнефтихим" тоже не спали в шапку и нашли замену "растворительному" бизнесу, который проворачивали в 2012 году. Место растворителей-разбавителей заняли битумные смеси. Так, за 8 месяцев экспорт битумных смесей на природных минеральных смолах увеличился аж в 95 раз. А экспорт антидетонаторов, антиоксидантов и прочих загустителей — в 6,3 раза. Эти наименования, надо полагать, не в списке нефтехимических товаров, с которых надо платить пошлину в российский бюджет. Как и в 2012 году, Россия всполошилась. Получается, что объем экспорта этого добра в 2 раза превышает объем его производства. Россияне опять намерены создать межведомственную рабочую группу для оценки потерь российского бюджета от нового белорусского гешефта. Прикидочно их оценили от 10 до 145 миллионов долларов.

В общем, на войне как на войне. Правда, во время последнего визита российского премьера Дмитрия Медведева в Минск вопрос ребром об этом, судя по информации СМИ, не ставился. А речь шла все о той же буксующей приватизации белорусских активов. На встрече премьеров наш Михаил Мясникович изъявил желание влиться в российскую платежную систему и шире в межгосударственных расчетах использовать российский рубль. Похоже, он совсем не дорожит белорусским рублем как атрибутом государственного суверенитета.

Но что же дальше? ВВП Беларуси и после сентябрьского замера показывает все тот же рост на 1,5% в пересчете на год. А надо — 3,3%. Снижать ставку рефинансирования (20%) для удешевления кредитов Нацбанку некуда, она и так сравнялась с инфляцией. В приказном порядке под давлением правительства банки кредитуют юридические лица не выше 32,5% годовых. МВФ и западные рейтинговые агентства прогнозируют минимальный рост белорусского ВВП и в 2015—2016 годах. В 2015 году прогнозируют все те же 1,5%, в 2016-м ожидают прибавку на уровне 2,7%. Инфляцию они за этот год видят 18,6%, далее соответственно 16,9% и 16,5%. Власти Беларуси под ударами судьбы также стали осторожны в своих прогнозах. ВВП, как они рассчитывают, в 2015 году должен вырасти на 2—2,4%, а уровень инфляции — снизиться до 12%.

И то верно. Следует давно смириться с тем, что пятилетние планы Всебелорусского собрания оказались нереальными и нереализованными. Не то чтобы оторваны от жизни, просто белорусская авторитарная экономическая модель могла обеспечить только восстановительный рост экономики в период конца 90-х годов прошлого столетия и в нулевых годах нынешнего. И то с решающей российской поддержкой. Россия сейчас находится под все более нарастающим давлением западных санкций. Как заявили США и ЕС, пока в Украине не установится мир, пока Россия не выведет свои войска и своих наемников с ее территории, санкции они не только не отменят, а будут наращивать. То, что по воле российского руководства в мире развернулась вторая холодная война — свершившийся факт. Экономика России стагнирует. Наступает оскудение притока валютной выручки от экспорта энергоносителей. Технологический бойкот, объявленный западниками России, подрывает ее способности к модернизации экономики и наращиванию добычи углеводородного сырья. Удешевление мировых цен на нефть продолжается. Это ударит и по белорусскому экспорту нефтепродуктов, который дает до трети валютных доходов. Усиление негативных явлений в российской экономике неминуемо будет сказываться и на экономике Беларуси. Целиком пошлины от белорусских нефтепродуктов оставлены Россией в белорусском бюджете только на предвыборный 2015 год. Дальше опять придется торговаться. Думается, что и в дальнейшем планы правительства Беларуси будут отличаться все большей скромностью. Тут уж не до амбиций.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Чаму Паўлу Левінаву забаранілі схадзіць у магазін?

"Народная Воля" не раз пісала пра дзікунскую сітуацыю з правядзеннем вулічных мерапрыемстваў. Паводле Канстытуцыі, кожны грамадзянін Беларусі мае на гэта права, на практыцы — атрымаць дазвол на акцыю часцей за ўсё проста немагчыма. Віцебскі праваабаронца Павел Левінаў вырашыў давесці сітуацыю да абсурду, каб кожнаму ўсё стала зразумела.

Павел Левінаў праінфармаваў Віцебскі гарвыканкам аб правядзенні адзінаасобнага вулічнага шэсця. У якасці маршруту ён пазначыў дарогу ад свайго дома да крамы "Віцебскія прадукты".

Дык ці можа чалавек у нашай краіне па законе схадзіць у магазін?

Левінаў атрымаў на гэта пісьмовую забарону. На падставе таго, што не выканаў патрабаванні рашэння гарвыканкама "Аб арганізацыі масавых мерапрыемстваў у горадзе Віцебску".

"Заяўка была пададзена ў гарвыканкам, бо мой маршрут у краму праходзіць па тэрыторыі двух раёнаў — Кастрычніцкага і Першамайскага. А забарону я атрымаў, бо не заключыў дамовы на абслугоўванне маёй адзінаасобнай акцыі з супрацоўнікамі міліцыі, паліклінікі і службы ЖКГ. Большы абсурд уявіць сабе цяжка: гарвыканкам патрабуе, каб я ішоў у краму ў суправаджэнні міліцыянта, урача і дворніка з мяцёлкай. Бо ў рашэнні гарвыканкама "Аб арганізацыі масавых мерапрыемстваў у Віцебску" гаворыцца, што заяўнікі, каб атрымаць дазвол на нейкую акцыю, мусяць разам з заяўкай падаваць і дамовы, заключаныя з цэнтральнай гарадской паліклінікай, міліцыяй і прадпрыемствам ЖКГ. У той самы час гарадскія ўлады прадэманстравалі і ўласнае няведанне заканадаўства. Бо, каб акцыя лічылася масавым мерапрыемствам, у ім павінны ўзяць удзел прынамсі два чалавекі. Я ж збіраўся ісці адзін. Значыцца, маё шэсце пад заканадаўства аб масавых акцыях не падпадае ўвогуле", — тлумачыць праваабаронца.

Павел Левінаў падрыхтаваў заяву ў суд наконт забароны адзінаасобнага шэсця. Там напісана, што гарвыканкам парушае ягонае права на правядзенне акцый. Праваабаронца лічыць, што патрабаванні рашэння гарвыканкама №881 невыканальныя — адпаведна, трэба прадэманстраваць уладам абсурднасць такіх дакументаў.

"За апошнія 5 гадоў, з часу прыняцця гэтага рашэння, у Віцебску не было дазволена ніводнай акцыі паводле ініцыятывы мясцовых актывістаў, — распавядае Левінаў. — *Бо міліцыя і паліклініка адмаўляюцца заключаць дамовы з заяўнікамі, спасылаючыся на розныя прычыны. Таму я імкнуся прадэманстраваць, што з такім падыходам пад парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах можна падвесці ўсё што заўгодна, у тым ліку персанальны паход у краму. Няхай віцебскія ўлады ведаюць, што іхнія высілкі выглядаюць проста смешна і не выклікаюць павагі ў грамадзян".*

Спроба давесці сітуацыю з масавымі акцыямі да абсурду ўжо не першая ў Паўла Левінава. Улетку ён падаваў заяўку ў Чыгуначную раённую адміністрацыю, каб правесці сход грамадзян, і не дзе-небудзь, а ў лазні. Аказалася, і там збірацца кампаніямі нельга: праваабаронцу адказалі, што і ў гэтым выпадку трэба заключаць дамовы з медыкамі, супрацоўнікамі ЖКГ і міліцыяй. Забарону мясцовых улад падтрымаў і суд Чыгуначнага раёна. Праваабаронца быў вымушаны прадпрыняць наступны крок — падаць заяву ў міліцыю на сябе самога.



"У лазню кампаніяй мы ўсё ж схадзілі. Атрымліваецца, парушыўшы заканадаўства. Пра гэта я і напісаў у заяве, а Чыгуначны РАУС быў вымушаны праводзіць праверку. Яе вынікі мяне і рассмяшылі, і разззлавалі: двое міліцыянтаў напісалі рапарты, што якраз у той самы дзень таксама былі ў лазні — "з мэтай памыўкі і адпачынку". І што мяне яны там не бачылі. Атрымліваецца, з майго боку не было і правапарушэння... Але якраз у той час, калі двое міліцыянтаў хадзілі ў лазню, яны мусілі быць на працоўных месцах у адпаведнасці з графікам службы! Выходзіць, яны мыліся і адпачывалі ў працоўны час, ды яшчэ з табельнай зброяй? Пра гэта я і напісаў ва ўпраўленне ўласнай бяспекі. Няхай там разбяруцца: ці супрацоўнікі міліцыі "прагулялі" працу для "памыўкі і адпачынку", ці ўвогуле ў лазні не былі. А ў рапартах напісалі хлусню — як неаднаразова бывала, калі супрацоўнікі міліцыі сведчаць, што актывісты "лаюцца матам" у грамадскім месцы", — гаворыць праваабаронца.

Павел Левінаў перакананы, што ўмовы атрымання дазволу на масавыя мерапрыемствы ў Віцебску трэба мяняць, бо яны невыканальныя. Гэтую праблему спрабуюць вырашыць і віцебскія партыйцы — яны неаднаразова судзіліся з-за забароненых акцый, патрабавалі змяніць рашэнне Віцебскага гарвыканкама №881, звяртаючыся ў самыя розныя інстанцыі. Аднак адусюль адказваюць, што яно прайшло юрыдычную экспертызу, унесена ў рэестр прававых актаў і таму нібыта абсалютна бездакорнае.

Алег СНОЎ.

СУД ДЫ СПРАВА

Удава супрацоўніка «Гомельшкла» адсудзіла ў прадпрыемства 100 тысяч долараў

Але ці атрымаецца вярнуць гэтыя грошы?

Няшчасны выпадак на прадпрыемстве "Гомельшкло" адбыўся ў лістападзе 2013 года. Пад грудай аскепкаў загінуў 50-гадовы разьбяр шкла пятага разраду. Ягоная жонка, таксама працаўніца завода, паспрабавала атрымаць аднаразовую матэрыяльную дапамогу, прадугледжаную калектыўнай дамовай пры такіх выпадках. Паводле дамовы, яна мела права на суму, роўную дзесяці гадавым заробкам мужа. Але звароты да кіраўніцтва прадпрыемства вынікаў не мелі, спагнаць грошы ўдалося толькі праз суд, які прызначыў наймальніку выплаціць удаве аднаразовую дапамогу ў памеры больш за 1 мільярд 140 мільёнаў рублёў. Праўда, кіраўніцтва завода з такім вердыктам не пагадзілася і абскардзіла яго, але абласны суд пакінуў рашэнне першай судовай інстанцыі без змяненняў.

Аднак ці атрымае ўдава належныя ёй па законе грошы? Справа ў тым, што паводле вынікаў першага паўгоддзя 2014 года "Гомельшкло" ўзначаліла спіс самых стратных ААТ Беларусі: страты прадпрыемства за шэсць месяцаў перавысілі 169 мільярдаў рублёў.

МОДЕРНИЗАЦИЯ

Что мешает белорусскому бизнесу зарабатывать на отходах?

В Беларуси перерабатывается чуть более 12% твердых коммунальных отходов, а в странах ЕС — порядка 80%. Сколько денег закопано на белорусских свалках?



Потенциал рынка по переработке вторсырья намерены взять в свои руки местные бизнесмены с условием, что государство не будет мешать им работать.

Сбор и переработка вторсырья в европейских странах — задача исключительно частной сферы, государство выполняет законодательную и контролирующую функции. В таком направлении должна двигаться и Беларусь, считают представители бизнеса.

— Сегодня мы зарастаем свалками вместо того, чтобы извлекать выгоду из вторичных ресурсов, — говорят бизнесмены. На первом заседании Совета по предпринимательству Виктор Маргелов просил власти указать бизнесу, какую нишу в работе с вторичными ресурсами он может занять. "Но наш вопрос остается пока без ответа", — отмечает председатель Президиума Республиканской конфедерации предпринимательства Владимир Карягин.

Белорусский бизнес проявляет инициативу и строит предприятия по переработке вторичных ресурсов, но коридор, в котором он может сегодня работать, очень узкий. Бизнесмены настаивают на возрастании своей роли и ответственности в ресурсосбережении. Вместе с этим, по их мнению, основной путь для развития белорусской экономики — создание и развитие конкурентной среды и равные условия для участников рынка в разных сферах. Эти изменения бизнес-сообщество называет приоритетными в рамках проекта "Реформум".

Закапываемые на свалках деньги можно превратить в реальный доход

В Евросоюзе 50—80% отходов перерабатывается и повторно используется в производстве. В Беларуси показатель перерабатываемых твердых коммунальных отходов не превышает 12,3%.

Займись бизнес активней переработкой отходов, в белорусскую экономику поступали бы дополнительные сотни миллионов долларов.

— Если сбор и переработка вторсырья перейдет в частные руки, к нему будет более серьезный подход из-за личной заинтересованности. Заниматься утилизацией вторсырья сегодня выгодно, в стране пока нет конкуренции, и поставщик сырья найдется всегда, — отмечает директор ЧСУП "Линия Сноса" Юрий Сулим.

Несколько лет его компания занимается сбором и утилизацией строительного мусора, получая из него щебень. За один год одна из дробилок перерабатывает около 67 тысяч тонн отходов, получая 100 тысяч тонн щебня. За два года работы компания выплатила 5 млрд рублей налогов. "Линия Сноса" остается единственным предприятием, работающим в этом направлении. По словам директора, в одиночку справиться с остатками от строительства и снесенных зданий компания не в состоянии — 90% всех строительных отходов подвергаются переработке. Чтобы утилизировать их максимальное количество, рынку нужны новые игроки.

— Бизнесмены уже присматриваются к возможностям работы с вторсырьем, возможно, скоро будет повышаться конкуренция, а вместе с ней и качество услуг. Главное, чтобы никто не мешал частникам работать, — отмечает Юрий Сулим.

Все компании должны быть заинтересованы в экологичной утилизации своих отходов

— У нас ответственность за утилизацию отходов, в частности упаковки, несет тот, кто производит тару, а во всем мире — тот, кто выпускает продукцию на рынок. Именно от него зависит, сколько и в каком виде получится отходов. Сегодня компании отвечают за утилизацию упаковки своей продукции только на бумаге. В реальности многие из них просто игнорируют возможность переработки вторсырья. В первую очередь следует совершенствовать законодательство, — считает председатель Республиканской ассоциации рециклинга и инноваций Михаил Счастный.

Он отмечает, что многие компании не выполняют требование Указа №313 "О некоторых вопросах обращения с отходами потребления", который обязывает производителей и импортеров нести ответственность за упаковку своей продукции после ее использования.

— Законодательство должно принуждать компании производить тару, которая может быть переработана, а не поощрять тех, кто намеренно отказывается от более экологичной упаковки, снимая с них ответственность, — считает эксперт.

Вместе с тем он отмечает, что достичь показателей по переработке вторсырья на предприятиях до 50% к 2020 году, как прогнозируется в дополнении к указу, подписанном этим летом, не получится без повышения роли частного бизнеса в переработке и утилизации вторичных ресурсов.

Представители бизнес-ассоциации планируют написать аналитическую записку в Администрацию президента по планам предприятий в расширении своей ответственности и роли в решении вопросов ресурсосбережения.

Ведь в малом и среднем бизнесе, как правило, более высокая производительность. А когда в экономике преобладают более эффективные предприятия, она становится эффективнее.

Надежда КАЛИНИНА.

ТРЫВОЖНА

Збіраемся ваяваць?

"На наступны год у нас на аэрадроме ў Бабруйску стануць на баявое дзяжурства 12 баявых самалётаў СУ-27, два вучэбныя самалёты Су-27 і звяно верталётаў з чатырох адзінак — гэта авіяцыя падтрымкі", — сказаў Сяргей Шайгу пасля ўдзелу ў сумеснай калегіі абаронных ведамстваў Беларусі і Расіі. Неабходнасць з'яўлення расійскіх самалётаў у Бабруйску Сяргей Шайгу патлумачыў патрэбай "супрацьстаяць новаму спектру выклікаў і пагроз". Паводле сцвярджэнняў Шайгу, Захад імкнецца сфарміраваць ва Украіне перадавы рубеж "ціску на Саюзную дзяржаву".

Не так даўно галоўнакамандуючы ВПС РФ генерал-палкоўнік Віктар Бондараў годам з'яўлення яшчэ адной расійскай авіябазы ў Бабруйску называў 2016-ы. Планы скарэкціравалі?

Дарэчы, Сяргей Шайгу паведаміў, што ўжо ў 2014 годзе Расія завершыць пастаўку ў Беларусь 4 ракетных комплексаў "С-300". Расійскі міністр абароны паабяцаў, што гэтыя ракеты будуць перададзены Беларусі бясплатна.

СТАЛІЦА

Мінчан паболела

З пачатку года колькасць жыхароў Мінска ўзрасла больш як на 7,5 тысячы чалавек. Сёння ў беларускай сталіцы жыве 1 млн 929,3 тыс. мінчан.

Што адметна, за кошт мігрантаў насельніцтва сталіцы паболела на 2917 чалавек. Як сцвярджаюць у галоўным статыстычным упраўленні Мінска, міграцыйны прырост насельніцтва зменшыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам 2013 года на 4189 чалавек, або на 59%.

У студзені—верасні 2014 года ў Мінску нарадзілася 17.626 дзяцей, памерла 13.025 чалавек, натуральны прырост насельніцтва склаў 4601 чалавек.

СПЕШИТЕ ВИДЕТЬ

Пояса заграничные, слуцкие

Богатое собрание белорусских слуцких поясов хранится теперь не только в музеях России.

Через несколько дней, а именно 5 ноября, в Национальном художественном музее откроется выставка слуцких поясов из Польши. В экспозиции будут представлены шесть поясов Слуцкой мануфактуры из богатейших коллекций Национального музея в Варшаве. А всего польское собрание музея насчитывает 300 кунтушовых поясов, из которых 58 — слуцкие.

Кирилл БУБНОВ.

ИСТОРИЯ: ПРАВДА И МИФЫ

Кто сжег Хатынь?

22 марта 1943 года белорусская деревня Хатынь вместе со всеми жителями была сожжена гитлеровцами. Однако до сих пор правда об обстоятельствах уничтожения белорусского села остается неизвестной и продолжает порождать немало мифов.

Одним из наиболее распространенных в прессе мифов по поводу сожжения Хатыни является то, что село сожгли не немцы, а "украинские националисты", точнее 118-й украинский батальон, действовавший в 1942—1944 годах в Беларуси. Истоки мифа очевидны — в 1980-х годах советскими "компетентными органами" было решено опорочить имя одного из деятелей украинской эмиграции на Западе Владимира Катрюка, служившего в свое время в указанном формировании.

Для этого в СССР был организован показательный процесс над бывшим адъютантом командира батальона Григорием Васюрой, где он лично и его сослуживцы заочно были обвинены в массовом убийстве мирных жителей. Но эпоха сталинских показательных судов уже прошла, и громкий процесс не получился — подсудимый ни в чем не сознался, да еще и делал провокационные заявления, обвиняя суд в давлении на свидетелей, а материалы дела так полностью нигде и не публиковались. Все же информация о "сожжении села украинцами" была запущена в оборот, хотя во всех серьезных исторических работах по этой проблеме как в СССР, так и за рубежом, на основании немецких документов однозначно указано, что село Хатынь было сожжено Особым батальоном СС под командованием Оскара Дирлевангера по приказу руководителя СС и полиции Генерального округа "Белоруссия" обергруппенфюрера Курта фон Готтберга.

Как же дело обстояло в действительности, и при чем здесь украинский батальон? Сегодня мы уже можем ответить на этот вопрос и восстановить события того дня на базе архивных материалов.



Логойский район Минской области, в котором размещалось село Хатынь, в 1943 году был очень неспокойным. Здесь действовала партизанская бригада "Народные мстители" под командованием В.И.Андриянова, которая почти парализовала работу немецких оккупационных властей. Для противостояния ей в район был брошен 118-й украинский батальон, сформированный немцами годом раньше в Киеве. Его костяк составляли добровольцы из Буковины, дополненные мобилизованными жителями Киева и области, офицеры — немцы и украинцы. Нужно отметить, что практика перебрасывания украинских формирований немецкой армии подальше от Родины была довольно распространенной — украинцы воевали во Франции, Италии, Югославии, в странах Балтии, в Польше, России и Беларуси, и лишь малая часть несла гарнизонную службу в Украине. Делалось это для того, чтобы избежать их перехода на сторону УПА, как это сделал, например, 104-й украинский батальон.

118-й батальон, которому надлежало контролировать сразу два района — Плещеницкий и Логойский, с задачей справлялся с трудом. Поначалу из-за отсутствия опыта и нехватки людей он мог лишь выезжать в места последних акций партизан и пытаться найти их, рейдируя по окрестным лесам.

Утром 22 марта 1943 года партизаны напали уже непосредственно на солдат украинского формирования. Они действовали по обычному сценарию — перерезали в одном месте телефонные провода, обеспечивающие связь штаба с немецким командованием, и устроили тут же засаду. В засаду попала группа солдат из первой роты 118-го батальона, направленная для устранения обрыва линии. В первые же минуты боя четыре человека были убиты. По сигналу на помощь сослуживцам двинулся весь батальон, под напором которого партизаны были вынуждены отступить, однако отошли почему-то не в лес, а в ближайшее село — Хатынь. Солдаты украинского батальона, не имея возможности полностью блокировать окруженное лесом село, начали штурм, в ходе которого было убито восемь партизан, а остальные рассеялись по окрестностям. Далее часть солдат заняла позиции вокруг села на случай подхода основных сил противника, а большинство занялось прочесыванием леса в поисках уцелевших партизан.

После боя к селу подъехала рота эсэсовцев из печально известного формирования оберштурмбаннфюрера Дирлевангера со своей конкретной задачей — сжечь село вместе с жителями "за поддержку партизан", в назидание другим.

